МАСТОЎСКАЯ РАЁННАЯ ГАЗЕТА

# Зара над Нёманам

www.mosty-zara.by

ГАЗЕТА ВЫДАЕЦЦА З 1945 ГОДА

№89 (8899)

СЕРАДА, 18 лістапада 2015 года

Цана 2000 руб.

# Славім золата хлеба і людзей залатых



Фото Н. ШЕВЧИК

**Штогод у лістападзе мы святкуем Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу. Штогод мы славім працавітых і надзейных людзей, улюбёных у сваю зямлю і сваю хлебаробчую справу. Дзякуючы іх залатым рукам, прыроднай мудрасці, беражлівым адносінам да зямлі, увазе да бліжняга, вопыту і цярпенню жыве і працвітае наша ўрадлівая мастоўская ніва.**

**Сёлета гасцей з усяго раёна на свята сустракала гасцінная гудзевіцкая зямля. Менавіта яе хлебаробы ў гэтым годзе забяспечылі адныя з самых высокіх намалотаў зерня і валавы збор кукурузы.**

**(Працяг тэмы на 4-й стар.)**

# Готовы Родине служить!

***Осенняя призывная кампания вступила в завершающую стадию: началась отправка призывников в Вооруженные Силы, другие войска и воинские формирования Беларуси. Уже на этой неделе для некоторых наших земляков начался новый этап жизни – жизни по Уставу, воинскому распорядку и армейским законам.***



Фото Н. ШЕВЧИК

В понедельник, 16 ноября, первая партия новобранцев нашего района отправилась к месту прохождения срочной военной службы. Ребята будут служить в силах специальных операций Вооружённых Сил.

-- Как и всегда, в данные войска был самый большой отбор, -- подчеркнул районный военный комиссар подполковник Дмитрий Францевич Богданович. – Ожидания только семи призывников, хорошо подготовленных физически и психологически, не имеющих проблем с законом, совпали с реальными предложениями и выбором представителей воинской части города Бреста.

Двенадцать мостовчан пополнят внутренние войска МВД Республики Беларусь. Очень серьёзный отбор прошли и претенденты в органы пограничной службы, которые также считаются элитой армии. Восемь наших земляков будут постигать пограничную науку на заставах Гродненского погранотряда.

**(Начало. Продолжение на 3-й стр.)**

**На снимке: повестку на срочную военную службу районный военный комиссар Д. Ф. БОГДАНОВИЧ вручает Алексею ПЕЦЕВИЧУ. Он будет служить на авиационной базе в г. Лида.**

## Новости области

# Спасибо за труд!

**Лучших тружеников полей и ферм собрал в Дятлово областной фестиваль-ярмарка «Дажынкі-2015».**

Праздничные мероприятия в городе начались с самого утра. На улице Советской была организована выставка-продажа продуктовых и промышленных товаров, продукции мастеров народного творчества. В Доме культуры развернулась выставка-презентация промышленного потенциала Дятловского района. Неподалеку в парке разместились тематические подворья районов Гродненщины.

Праздничная колонна участников торжественного шествия победителей областного соревнования на уборке урожая 2015 года прошла к Центру культуры, где и состоялась церемония вручения премий. Открыл областной фестиваль председатель облисполкома Владимир Кравцов.

– Все сельскохозяйственные работы года, от посевной до уборки, проходили в непростых условиях. Несмотря на это, наши труженики села и в нынешнем году старались выполнить весь плановый объем сельскохозяйственных работ, получить запланированный урожай, – отметил руководитель области. Уборка зерновых, картофеля, овощей и плодов проведена высокими темпами и качественно. Уборка и перевозка сахарной свеклы идет к завершению.

Как подчеркнул Владимир Кравцов, главную задачу по обеспечению страны продовольствием агропромышленный комплекс выполнил. Сейчас особенно важно обеспечить финансовую устойчивость хозяйств, ускорить их выход на самофинансирование.

От имени руководства страны слова глубокой признательности и благодарности в адрес сельских тружеников высказал заместитель премьер-министра Республики Беларусь Михаил Русый. Он отметил, что сельскохозяйственная отрасль Гродненщины традиционно лидирует в республике, на нее равняются другие области. Михаил Русый вручил Грамоту Совета Министров Герою Беларуси, председателю СПК «Прогресс-Вертелишки» Василию Ревяко.

Лучшим труженикам полей и ферм вручены почетные грамоты областного Совета депутатов, областного объединения профсоюзов, БРСМ.

БЕЛТА

# Славім золата хлеба і людзей залатых



Дыплом райвыканкама Д. А. Альшэўскі ўручае старшыні ААТ «Чарлёна» Г. М. ШАТУЕВУ за перамогу ў спаборніцтве па вытворчасці прадукцыі раслінаводства.



Кіраўнікі ААТ «Чарлёна» Г. М. ШАТУЕЎ, філіяла «Дубна» В. В. КЕМЯЖУК, ЗАТ «Гудзевічы» А. А. САНЬКО.



Узнагароду за добрасумленную працу ўручае старшыня райкама прафсаюза работнікаў АПК В. М. МЯТЛЮК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спакон вякоў земляробчыя святы былі самымі яркімі і шчодрымі. Гэта добрая даўняя традыцыя – ушаноўваць і дзякаваць хлебаробам за нялёгкую працу – зараз набыла новае дыханне.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў свята звярнуўся першы намеснік старшыні – начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання раённага выканаўчага камітэта Д.А. Альшэўскі.

-- Поспехі на палях і фермах даюцца нялёгка, яны патрабуюць не толькі матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў, але і інтэлектуальных затрат, і высакароднасці душы аграрыяў, -- падкрэсліў Дзяніс Аляксандравіч.

У раёне вядзецца планамерная работа па развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы аграпрамысловага комплексу. Так, толькі за мінулы год на гэтыя мэты было накіравана больш за 54 мільярды рублёў. За апошнія гады пабудаваны новыя малочна-таварныя комплексы, рэканструяваны існуючыя фермы, закуплена высокапрадукцыйная тэхніка.

Была адзначана зладжаная работа спецыялістаў і работнікаў ЗАТ "Гудзевічы" (дырэктар А. А. Санько) і ААТ "Чарлёна" (дырэктар Г. М. Шатуеў). Першая гаспадарка прызнана пераможцай раённага спаборніцтва на ўборцы зерневых і зернебабовых культур, другая -- адзначана за дасягненне высокіх паказчыкаў па вытворчасці прадукцыі раслінаводства. Тут жа сёлета вырашчаны самы высокі ўраджай рапсу, бульбы і цукровых буракоў.

Добрых вынікаў на ўборцы зерневых і зернебабовых дасягнулі хлебаробы СВК "Азяранскі" (старшыня І. В. Шышлоўскі), а галоўны аграном гаспадаркі – Аляксандр Уладзіміравіч Куршук – прызнаны пераможцам раённага спаборніцтва сярод галоўных аграномаў сельскагаспадарчых арганізацый. Перамогу сярод упраўляючых участкамі таксама святкаваў спецыяліст СВК «Азяранскі» Аляксандр Валянцінавіч Нагуй.

Паспяхова завяршаюць год і работнікі філіяла "Дубна» (дырэктар В. В. Кемяжук), дзе забяспечылі выхад кармавых адзінак з бала-гектара сельскагаспадарчых угоддзяў у памеры 182,8 кілаграма. Узнагародай быў адзначаны вядучы спецыяліст па кормавытворчасці філіяла П. В. Веляпольскі.

-- Нягледзячы на ўсе цяжкасці і прыродныя катаклізмы, аграрыі Мастоўшчыны зрабілі ўсё магчымае, каб дасягнуць добрых вынікаў і дастойна адсвяткаваць сваё прафесійнае свята. Высокія пазіцыі займае раён у вобласці і рэспубліцы па прадукцыйнасці жывёл і прывесу буйной рагатай жывёлы, -- адзначыў Дзяніс Аляксандравіч.



Хлеб-соль -- працаўнікам палёў і ферм Мастоўшчыны.



Узнагароды Мастоўскага райвыканкама і прэзідыума раённага Савета дэпутатаў уручыў старшыня райсавета В. І. ТАБАЛА.

Шчырыя словы ўдзячнасці прагучалі для пераможцаў і прызёраў абласнога спаборніцтва па жывёлагадоўлі. Гэта Людміла Вітальеўна Ялоўчык – аператар па адкорму свіней ЗАТ "Гудзевічы", Тэрэса Станіславаўна Сях – брыгадзір жывёлагадоўчай фермы ААТ "Чарлёна", Алена Георгіеўна Кравец – аператар па абслугоўванню свінаматак філіяла "Мастоўскі кумпячок" ААТ "Агракамбінат "Скідзельскі", Таццяна Віктараўна Бычак – аператар машыннага даення кароў філіяла "Дубна" ААТ "Агракамбінат "Скідзельскі", Таццяна Анатольеўна Траян – аператар па вырошчванню (адкорму) маладняка буйной рагатай жывёлы СВК "Азяранскі", Станіслаў Янавіч Рыжэўскі – начальнік свінаводчага комплексу ЗАТ "Гудзевічы".

Узнагародамі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Гродзенскага аблвыканкама па выніках спаборніцтва на корманарыхтоўцы былі адзначаны таксама камбайнер кормаўборачнага камбайна філіяла "Дубна" Аляксандр Барысавіч Васільеў і вадзіцель гэтай жа гаспадаркі Павел Якаўлевіч Кузьміцкі.

Больш за дзве з паловай гадзіны працягвалася ўшанаванне лепшых работнікаў сельскай гаспадаркі раёна. Дзесяткі чалавек падняліся на сцэну Гудзевіцкага цэнтра вольнага часу і культуры, дзе іх чакалі заслужаныя ўзнагароды, шчырыя словы падзякі, кветкі і моцны поціск рукі ад кіраўнікоў. Са святам аграрыяў віншавалі першы намеснік старшыні райвыканкама Д. А. Альшэўскі, выканаўчы дырэктар Гродзенскага абласнога аграпрамысловага саюза А. А.Нарэйка, старшыня Мастоўскага раённага Савета дэпутатаў В.І. Табала, старшыня раённага камітэта прафсаюза работнікаў АПК В. М. Мятлюк, а таксама прадстаўнікі Ваўкавыскага мясакамбіната, Ваўкавыскага ААТ "Беллакт" і таварыства з абмежаванай адказнасцю "Гроднааграінвест".

Свае музычныя падарункі гасцям і ўдзельнікам свята шчыра дарылі народны ансамбль народнай песні "Ярыца", Барыс Плішань, салісты Ірына Сідар, Вольга Мелех і Аляксандр Вітовіч, танцавальны калектыў Азёркаўскага клуба з танцам "Котчынская кадрыля", а таксама артысты Слонімскага раёна. Свае найлепшыя віншаванні і пажаданні вяскоўцам выказалі вядучыя мерапрыемства Сяргей Кузьміцкі і Жанна Бакун.

**Н.ШЭЎЧЫК**
**Фота аўтара**



Свежим взглядом

# Прикоснуться к истокам



**Работа учащейся 10 класса государственного учреждения образования «Песковский учебно-педагогический комплекс детский сад-средняя школа» Анны Квартник удостоена диплома III степени на VII областном конкурсе (конференции) исследовательских работ по учебным предметам учащихся учреждений общего среднего образования «Хрустальная Альфа». Свою работу «Ойконимы и микротопонимы родного края» Анна представила на секции «Русский язык».**

Каждый из нас в течение всей своей жизни постоянно сталкивается с самыми различными географическими названиями. Но каждый ли из нас знает, почему та или иная страна, город, деревня, река, озеро названы так, а не иначе? В самом деле, почему место, в котором вы родились, носит такое, а не какое-либо другое название? История возникновения названий уходит в века. Но каждый при желании может исследовать топонимические названия своей местности – что и сделала Анна.

Аня живёт в деревне, любит свой родной край, патриот своей страны. Для неё важно, чтобы подрастающее поколение знало происхождение географических названий родного края. Анна уверена, что изучение и сохранение местных топонимов – это верный путь к раскрытию новых страниц в истории родного края, который позволит не потерять связь поколений, даст дополнительную информацию о природе, истории и географии родных мест. Каждый населённый пункт, по твёрдому убеждению Ани, – это история, которую необходимо знать, понимать и уважать.

«Географические названия с течением времени могут изменить свой звуковой облик, могут в связи с бурным развитием экономики, урбанизацией вовсе исчезнуть. Этот процесс, к сожалению, необратим, он продолжается ежегодно. Поэтому необходимо делать всё возможное и невозможное для того, чтобы жители гордились своей деревней, своим селом и не смущались необычных названий населённых пунктов, в которых проживают, а сумели грамотно объяснить их происхождение каждому человеку», – считает автор исследовательской работы.

В своей работе вместе с руководителем Галиной Иосифовной Головенко, учителем русского языка и литературы, Анна выявила происхождение названий более тридцати населённых пунктов Мостовского района. Сделала их словообразовательный анализ, установила закономерность возникновения, развития и трансформации исследуемых названий. Составила классификацию рассматриваемых топонимов, показала связь топонимов с историческим прошлым Беларуси, с хозяйственной и духовной деятельностью нашего народа, с его самобытными языком и культурой. Выяснила распространённость заимствований из других языков.

Исследовательская работа имеет практическое применение: выпущены брошюры «Ойконимы и микротопонимы Мостовского района» и «Топонимические загадки». Данный материал привлекается во внеклассной работе, а также на уроках географии, истории, русского языка и литературы. Брошюры находятся в свободном доступе в школьном историко-краеведческом музее и в школьной библиотеке.

В прошлом учебном году данная работа была удостоена диплома I степени на VII открытой районной научно-практической конференции «Поиск. Творчество. Познание», которая проходила в гимназии №1 г.Мосты, и диплома I степени на XV открытой районной научно-практической конференции «Ступени к науке» в Слониме.

Аня активно участвует во всех общественных делах класса, школы, района. Отлично учится. Занимает активную жизненную позицию, является членом Молодёжного парламента учреждений образования Мостовского района. Анне свойственны настойчивость, целеустремлённость, старательность и работоспособность.

**Г. ГАХ,**
**заместитель директора по основной деятельности**

Наш край

# Тайны забытых вёсак



**Вёска – гэта цэлы свет, яркі, цэльны, своеасаблівы, поўны жыцця. Каб спазнаць яго, патрэбны не гадзіны і дні, а месяцы і гады. Вёска –гэта наша радзіма. Але сыходзяць людзі, сыходзіць традыцыйны побыт, знікаюць з ім і цэлыя вескі...**



На левым беразе ракі Шчара стаіць аднайменная весачка, "тайну" якой раскрыла ў сваім даследаванні вучаніца 11 класа ДУА "Курылавіцкі вучэбна- педагагічны комплекс дзіцячы сад- сярэдняя школа" Кацярына Сідорка пад кіраўніцтвам настаўніка біялогіі і геаграфіі Тамары Іванаўны Сідорка.

Сёння ў вёсцы пражываюць толькі два чалавекі, а ў 50-60 гады мінулага стагоддзя тут "бурліла" жыццё. Мала хто цяпер ведае, што ў пасляваенны час тут дзейнічаў смолзавод "Шчара", рэшткі якога (бочкі, жалабы) захаваліся да цяперашняга часу. Выраблялі неачышчаны шкіпінар, каніфоль, драўняны вугаль.

У ходзе даследавання ўдалося ўзнавіць звесткі пра малы промысел, так як кожны з нас хоць раз у жыцці карыстаўся прадуктамі смолзавода. Дарэчы, вучаніца робіць выснову, што працэс вытворчасці гэтых прадуктаў мала ў чым змяніўся ў наш тэхналагічны век. Разам з тым даследавана гісторыя вёскі, запісаны легенды і паданні, звязаныя з гэтым населеным пунктам, вызначаны прычыны паступовага яго знікнення.

Адной "тайнай" на зямлі стала менш. Але ці была гэта "тайна"? Напэўна, не. Гэта проста жыццё, якое імкліва ідзе ўперад.

Лічу, што кожны з нас можа стаць носьбітам ведаў аб сваім краі, аб гістарычных і духоўных каранях. Кожны можа стаць захавальнікам спадчыны, сябрам і абаронцам свайго роднага кутка.

Вынікі свайго даследавання Каця Сідорка прадставіла на абласны конкурс даследчых работ "Крыштальная Альфа" і атрымала Дыплом II ступені.

**Д.СЕБАСЦЬЯНОВІЧ,**
**намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА "Курылавіцкі вучэбна- педагагічны комплекс дзіцячы сад- сярэдняя школа "**

Падарожжы

# Адкрыцці ў час канікул



На канікулах мы, вучні Мілявіцкага дзіцячага сада-сярэдняй школы, ездзілі на экскурсію ў маёнтак "Каробчыцы". Кіравала нашай паездкай педагог-арганізатар нашай школы Алена Іосіфаўна Русак -- цікавы, дапытлівы, энергічны, няўрымслівы чалавек і настаўнік. Мы з ёй ужо шмат дзе пабывалі.

У Каробчыцах мы многа гадзін вандравалі і здзіўляліся, пабачылі многа новых жывёл і птушак, якіх дагэтуль не бачылі, ездзілі на карэтах, бегалі па мосціках, наведалі "Горад майстроў", разглядвалі скульптурныя кампазіцыі, фатаграфаваліся, частаваліся ў тутэйшым кафэ.

Паездка аказалася карыснай: яна прывіла нам любоў да прыроды, адкрыла свет новых прафесій і заняткаў.

Цяпер мы рэкламіруем маёнтак "Каробчыцы" сярод нашых сяброў і бацькоў. "Каробчыцы" - вельмі вартая і прыгожая мясціна ў Беларусі.

Куды мы накіруемся ў наступны раз?! Раскажам абавязкова!

**Я. ГАЛАВАЧ,**
**вучань 6 класа,**
**Мілявіцкага дзіцячага сада – сярэдняй школы**




**УВАЖАЕМАЯ ЛИЛИЯ ЧЕСЛАВОВНА ЕРЕМИЧ!**

**Поздравляем Вас с юбилеем!**

*Желаем крепкого здоровья,*
*От всей души - удач во всём,*
*И настроения такого,*
*Что все невзгоды - нипочём!*

**Администрация и профком ЗАО «Гудевичи»**

**ДАРАГАЯ ГАННА ІВАНАЎНА КАМАРЧУК!**

*Мы шчыра жадаем у дзень юбілея,*
*Хай радасць і шчасце сэрца сагрэюць,*
*Хай добрыя весткі прыходзяць у хату*
*І стол на прысмакі будзе багаты.*
*Яшчэ мы жадаем здароўя без лекаў,*
*Дабра і спакою, і доўгага веку,*
*Няхай абмінаюць бяда і трывога,*
*І гладкай жыццёвая будзе дарога!*

**З павагай сям'я Урбановічаў**

**УВАЖАЕМЫЙ ВИТАЛИЙ НИКОЛАЕВИЧ ТРУБЕНОК!**

**Поздравляем Вас с днём рождения!**

*Желаем Вам всегда успеха,*
*Энергии, здоровья, доброты,*
*Событий интересных, дружбы, смеха*
*И наяву исполненной мечты!*
*Хороших впечатлений, встреч прекрасных,*
*Большой удачи, радости и сил,*
*И чтобы каждый вечер было ясно,*
*Что день минувший вновь счастливым был!*

**Коллектив работников Мостовского РОВД**

### Спорт

# Когда гребля для души и жизни



**Плавание, велопрогулки, тренажёрный зал – сегодня существует множество разных видов спорта, упражнений и способов активного времяпрепровождения для того, чтобы быть здоровым и иметь подтянутое тело. Быть сильным и здоровым - вот к чему необходимо стремиться в жизни.**

Александр Рогацевич уже сделал выбор в пользу гребного вида спорта. Совсем скоро, после окончания УО «Гродненское государственное училище олимпийского резерва», молодой человек станет тренером-преподавателем. Он сам сможет учить детей осваивать спорт. В прошлом году Александр закончил среднюю школу №3 г. Мосты, всё так же занимается в ГУ «Гродненский областной центр олимпийского резерва по гребным видам спорта». Нельзя не отметить трудолюбие и ответственность, что показывает спортсмен на ежедневных тренировках.

-- Моими кумирами в спорте всегда остаются братья-каноисты Андрей и Александр Богдановичи. Для сборной Беларуси победа братьев Богдановичей открыла счёт золотым медалям на первых Европейских играх в Баку, -- поделился Александр Рогацевич.

Александром тоже может гордиться Мостовщина. В этом сезоне он выполнил норматив в мастера спорта Республики Беларусь по гребле на байдарках и каноэ, на чемпионате Республики Беларусь в каноэ-двойке был пятым на дистанции 1000 м, на первенстве Республики Беларусь (1997 г.р.) завоевал бронзу в одиночке на дистанции 1000 м.

Парень родился и вырос в Микелевщине Мостовского района. Он рассказал нам, что привело его в данный вид спорта и почему он не жалеет о сделанном выборе. С детства Александр увлекался футболом. И как это часто случается, родители волновались за ребёнка, чтобы тот не получил травмы. Но Александр задался целью и твёрдо шёл к ней. Летом в восьмом классе он побывал в детском спортивно-оздоровительном лагере отдела образования, спорта и туризма Мостовского райисполкома в деревне Дашковцы, а уже через полгода к нему приехал тренер Вадим Иванович Копать и предложил продолжить тренировки в Мостах в центре олимпийского резерва по гребным видам спорта. С того времени Александр усердно начал тренировки и продолжил учёбу в средней школе №3.

Какой спортсмен хочет останавливаться на достигнутом? С каждым годом человек всё больше старается добиваться определённых результатов, радовать себя и близких, а позже и всё общество.

-- Хочу получить высшее образование, но и о спорте не забывать. Ведь, как сказал олимпийский чемпион, российский каноист Максим Опалев: «Спорт без меня сможет, а я без спорта нет». Поэтому будем ставить новые цели и добиваться их, -- размышляет Александр Рогацевич.

Что необходимо для победы? Конечно, очень большая физическая и моральная подготовка. Александр считает: когда спортсмен отправляется на соревнования, неважно, какую дистанцию он преодолевает. Все лодки идут нос в нос в доли секунд. Вот тогда нужно показать характер, свой потенциал и, сжав зубы, работать до последнего гребка. Только тогда к тебе придет результат.

**А. МАКАР**

### Мастер-класс

# Кукла в доме - на удачу и счастье

**Научиться делать славянских кукол своими руками совершенно бесплатно можно было в Мостовском районном центре ремесел 11 ноября 2015 года на Неделе культуры. Преподать урок рукоделия всем желающим с удовольствием вызвалась мастер народных промыслов Татьяна Анатольевна ВАНГУЛ.**



- Подобных кукол люди стали делать очень давно, когда еще не верили в Бога. Так они защищались от злых духов, – начинает с небольшого исторического экскурса умелица. – Причем, все куклы были непохожими друг на друга и служили разным целям.

Будем делать сегодня «Благополучницу».

Коротко весь процесс выглядел так. Берем пенопластовый шарик, оборачиваем его белой тканью и обматываем крепкой нервущейся нитью. Это голова. Дальше вырезанный круг из ткани стягиваем по контуру нитью, плотно наполняем ватой и затягиваем. Это платьице-туловище. Сшиваем одно со вторым ниткой. Макет человечка готов. Затем кусочек ткани складывается определенным образом в узкую полоску, завязывается узелком (чтобы кукла не растеряла все блага, а держала их при себе) и обматывается крепкими нитками вокруг оберега – это руки, скрещенные в замок на животе. Кукла ведь «Благополучница». Последний штрих - фартушек и косынка. Шедевр готов! Все участницы мастер-класса получили подарки, сделанные своими руками. И захотели прийти снова!

Важная особенность. В древности кукол обязательно делали из рваных кусочков ткани именно своей одежды, не чужой. Нужно было связывать их красной нитью, а не резать. Так сохранялась аура человека. Традиционно использовалась печная зола, глина, солома, трава и человеческий волос.

Многим интересно, почему куклы безликие. Потому что наши предки опасались, что в оберег вселится злой дух. Также было важно, чтобы кукла была ни на кого не похожа.

Примечательно, что куклы-обереги наделялись особым магическим значением и участвовали в многочисленных обрядах: посеве, сборе урожая, свадьбе, рождении младенца. А еще их начиняли зерном или травами, собранными непременно в волшебную ночь на Ивана Купалу. В голодные годы или сезон посевов брали горстку-другую зернышек из куклы. Кстати, о состоятельности семьи также судили по наполненности куклы. Много зернышек – богатые люди. Мало – бедняки. Стоит отметить, что игрушкой такой оберег нельзя назвать, потому что в руки к детям он не попадал. Зато всегда украшал дом в почетном углу.

- Раньше еще в куклу клали вырезанное красное сердечко вовнутрь, чтобы была живая. Оберег «ходил» по дому и стоял в разных местах до тех пор, пока ее перестанут замечать. Это значит, он выбрал свое место, - рассказывает интересные подробности Жанна Леонтьевна Новик, директор Мостовского районного центра ремёсел.

Все куклы в центре подписаны, чтобы не ошибиться в выборе. Самая бюджетная - «Подорожница» - обойдется всего в 30 тысяч белорусских рублей. За 60 тысяч рублей можно приобрести «Травницу», «Женское счастье» и «Матулю». «Крупеничка» стоит 70 тысяч, а свадебные «Неразлучники» - 120 тысяч рублей.

А еще можно записаться на мастер-класс и сделать любую из кукол своими руками.

**В.ТРЫНКИНА**

Нам. галоўнага рэдактара Наталля Аляксееўна ШЭЎЧЫК

Зара над Нёманам
Мастоўская раённая газета.
Газета выходзіць у сераду і суботу.
У тыдзень выпускаецца два нумары.
Выдаецца ў г.Масты, Гродзенскай вобласці, Рэспубліке Беларусь.
Заснавальнікі: раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў, працоўны калектыў рэдакцыі.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №1214.
Выдадзена 8 лютага 2010 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 231600, г.Масты, вул.Савецкая,34
Індэкс 64033

ТЭЛЕФОНЫ: галоўнага рэдактара --3-21-65, нам. гал. рэдактара -- 3-24-33, адк. сакратара -- 3-22-29, аддзела пісьмаў-- 3-33-45, аддзела сац.-эканамічнага развіцця -- 3-35-85, бухгалтэрыі і аддзела рэкламы -- 3-35-23, камп'ютарнага цэнтра -- 3-23-17, аддзела радыёвяшчання -- 6-13-57.

Наш сайт у інтэрнэце: http: //www.mosty-zara.by
E-mail: zarja@mail. grodno. by

ISSN 2218-919X

Набор і вёрстка камп'ютарнага цэнтра "Зары над Нёманам"
Газета надрукавана афсетным спосабам у ГАУПП "Гродзенская друкарня": 230003, г.Гродна, 3, вул. Паліграфістаў, 4. Разл.рахунак рэдакцыі №3015240090011, РКЦ №10 у горадзе Масты філіяла ААТ «Белаграпрамбанк» -Гродзенскае абласное ўпраўленне, код банка 457, УНП 500126806, ОКПО 02478504.
Падпісана да друку 17 лістапада ў 10.00. Тыр. 4122 Зак.6862

Адказнасць за падбор і выкладанне фактаў нясуць аўтары публікацый. Выказаныя ў іх думкі могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.
За змест аб'яў і іншай рэкламы рэдакцыя не адказвае. Усе даведкі ў рэкламадаўцаў.